# ВЫКАРЫСТАННЕ ДЫСТАНЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

***Воўк Тацяна Эдуардаўна,***
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры, ДУА «Ходасаўская сярэдняя школа» (аг. Ходасы,Рэспубліка Беларусь)*

Дыстанцыйнае навучанне – шырокі спектар адукацыйных паслуг, у рамках якіх вычні навучаюцца на адлегласці, не знаходзячыся ў класным памяшканні. Яно вырашае задачы, якія традыцыйнае навучанне рашыць не можа, гэта, перш за ўсё: узмацненне актыўнай ролі вучняў у асабістым навучанні, выкарыстанне даступных адукацыйных рэсурсаў, прымяненне інтэрактыўных формаў заняткаў, павышэнне матывацыі да навучання, наяўнасць умоў для самавыражэння, насычанасць і інтэнсіўнасць навучання, магчымасць атрымання экспертнага заключэння вынікаў сваёй вчэбнай дзейнасці.

**Ключавыя словы і словазлучэнні:** вучэбная матывацыя, пазнавальная актыўнасць, адукацыйныя рэсурсы, рэсурсы сеткі Інтэрнэт, Google-формы.

У сучаснай адукацыйнай сістэме значнае месца сталі займаць дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі, пад якімі прынята разумець адукацыйныя тэхналогіі, што рэалізуюцца ў аснове сваёй з дапамогай інфармацыйна-тэлекамунікатыўных сетак пры ўзаемадзеянні навучэнцаў і педагагічных работнікаў на адлегласці.

Выкарыстанне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій – гэта якасна новы ўзровень узаемадзеяння паміж настаўнікам і вучнем. Сучаснае грамадства патрабуе актыўную асобу, здольную арыентавацца ў бязмежным інфармацыйным патоку, накіраваную на непарыўнае самаразвіццё і самаадукацыю. У падобнай сітуацыі на настаўніка кладзецца новая функцыя – роля праваднiка ведаў, дапаможцы і кансультанта. Веды ўжо выступаюць не як мэта, а як спосаб развіцця асобы.

Мадэль арганізацыі навучання з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій разлічана: на школьнікаў, якія жадаюць набыць новыя веды, апантаныя канкрэтным прадметам, удзельнікаў алімпіяд і конкурсаў; на вучняў, у якіх ёсць цяжкасці ў навучанні, на тых, у каго няма магчымасці атрымаць адукацыйныя паслугі на ўроку (адсутнічаюць у школе па прычыне хваробы); для работы пры фарс-мажорных абставінах (адмена заняткаў у школе па прычыне прыродных умоў, каранціна і г.д.)

Асноўнымі прынцыпамі прымянення дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій з’яўляюцца: прынцып інтэрактыўнасці, які выражаецца ў магчымасці пастаянных кантактаў усіх удзельнікаў вучэбнага працэса з дапамогай спецыялізаванага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя (у тым ліку электронная пошта, відэасувязь, Интэрнэт-канферэнцыя, anline -тэсты); прынцып адаптыўнасці, які дазваляе лёгка выкарыстоўваць вучэбныя матэрыялы новага пакалення з лічбавымі адукацыйнымі рэсурсамі, у канкрэтных умовах адукацыйнага працэса; прынцып гібкасці, што дае

магчымасць удзельнікам вучэбнага працэса працаваць у неабходным для іх тэмпе і ў зручным для сябе час; дазваляе выкарыстоўваць вучню неабходныя вучэбныя рэсурсы для рэалізацыі індывідуальных навучальных інтарэсаў; прынцып аператыўнасці і аб’ектыўнасці ацэньвання вучэбных дасягненняў навучэнцаў.

Сучасная рэальнасць дазваляе рэалізавать адукацыйныя праграмы, выкарыстоўваючы дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі, якія ўключаюць у сябе разнастайныя электронныя інфармацыйныя і адукацыйныя рэсурсы, інфармацыйныя і тэлекамунікацыйныя тэхналогіі, адпаведныя тэхналагічныя сродкі, што даюць магчымасць навучэнцам засвоіць праграмы ў поўным аб’ёме незалежна ад месца знаходжання.

Мэтай выкарыстання дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у класічную сістэму навучання з’яўляецца магчымасць забяспечыць даступнасць якаснай адукацыі для навучэнцаў, калі месца пражывання, сацыяльнае палажэнне і стан здароўя могуць аказаць уплыў на даступнасць адукацыі.

Дыстанцыйнае навучанне, як і вочнае, у сваёй аснове прадугледжвае засваенне вучэбнай праграмы, падручніка, выкарыстанне паўрочных метадычных рэкамендацый і падрабязных інструкцый настаўніка.

Плануючы падачу матэрыяла дыстанцыйна, неабходна ўлічваць, што вучні ўспрымаюць новы матэрыял і замацоўваюць яго індывідуальна, бескантрольна ў рэжыме рэальнага часу і ў залежнасці ад ступені сваёй падрыхтаванасці і навучальнасці.

Прымяняючы дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі, настаўнік рашае наступныя задачы: павышэнне вучэбнай матывацыі, развіццё ў навучэнцаў пазнавальнай актыўнасці сродкамі развіцця ўмення працаваць з рознымі дадатковымі крыніцамі інфармацыі, якія патрабуюць выкарыстання тэхнічных магчымасцяў камп’ютара і сеткі Інтэрнэт; развіццё ў навучэнцаў самастойнасці ў вучэбным працэсе.

У працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры выкарыстоўваю прэзентацыі пры вывучэнні біяграфій пісьменнікаў у 9-11 класах, напрыклад: В.Быкаў. «Жыццё і творчасць», Якуб Колас. «Падарожжа на радзіму пісьменніка», М. Танк. «Слухаю, Нарач, твой пошум сасновы…», М.Гарэцкі. «На радзіму земляка» і інш, відэа- і аўдыяфайлы, тэксты па розных тэмах, электронныя падручнікі і трэнажоры, гукавыя дыктанты і пераказы, электронныя энцыклапедыі, электронную бібліятэку, матэрыялы лінгвістычных і літаратуразнаўчых сайтаў (некаторыя з іх: сайт «Добры настаўнік», nastaunik.info, сайт «Беларусачка» і інш). Усе гэтыя матэрыялы можна выкарыстоўваць як на вучэбных занятках, так і ў працэсе дыстанцыйнага навучання, накіроўваючы дзіцяці.

Урокі беларускай літаратуры дазваляюць арганізаваць прагляд відэаматэрыялаў як ілюстрацыйны матэрыял да вывучаемых твораў, якія дапамагаюць супаставіць аўтарскую і рэжысёрскую інтэрпрэтацыю, параўнаць фрагменты тэкста і відэафрагмента, напрыклад, урыўкі з

кінафільма, створанага паводле рамана І.Мележа Людзі на балоце», У.Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», «Паром на бурнай рацэ», Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» і інш. выканаць заданні на аднаўленне сюжэтнай лініі твора, праанaлізаваць паэтычны тэкст паводле вершаў М.Багдановіча, вывучаемых у 9 класе, а таксама арганізаваць гутарку па прагледжанаму ўрыўку. Выкарыстоўваю ў сваёй рабоце відэаўрокі, якія апавядаюць пра жыццё і творчасць паэтаў і пісьменнікаў. Вынікам прагляда такіх урокаў могуць быць канспекты ў старэйшых класах або выкананне тэставых заданняў. Самакантроль ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў могуць ажыццяўляцца з дапамогай дыстанцыйных тэхналогій: рознаўзроўневыя анлайн-тэсты па тэме «Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова», дыдактычныя матэрыялы анлайн, кантрольна-вымяральныя матэрыялы, тэсты-віктарыны па тэмам «Просты сказ», «Просты сказ ускладненай пабудовы» (8 клас), красворды (К.Чорны. Раман «Пошукі будучыні»), крыжаванкі па тэмам, складзеным у Google-формах і інш.

Метады дыстанцыйнага навучання абавязкова павінны ўключаць у сябе традыцыйныя віды дзейнасці навучэнцаў на занятках беларускай мовы і літаратуры: работа з падручнікам, пісьмовыя работы ў сшытках, вуснае апытанне, выкананне ілюстрацый, чытанне, пераказ, аналіз тэкста, чытанне на памяць, выкананне розных творчых работ і многае іншае.

Такім чынам, дыстанцыйнае навучанне не можа замяніць у поўным аб'ёме непасрэднае супрацоўніцтва настаўнік – вучань , але пры граматным выкарыстанні становіцца добрым дапаможцам у рэалізацыі адукацыйных праграм. Пры рацыянальным злучэнні дыстанцыйных і здароўезберагальных тэхналогій дае ідавочныя вынікі, галоўным з якіх становіцца павышэнне вучэбнай матывацыі. Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што выкарыстанне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у традыцыйным навучанні дапамагае стварыць атмасферу ўзаемнага супрацоўніцтва, дазваляе навучэнцу адчуваць падтрымку з боку настаўніка, можа садзейнічаць усталяванню больш даверлівых зносін паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу і, такім чынам, індывідуалізацыі навучання.

Вопыт прымянення дыстанцыйных тэхналогій дае права гаварыць пра шэраг пераваг такога навучання: для навучэнцаў становіцца даступнай «перакрыжавальная» інфармацыя, бо адкрываецца магчымасць звяртання да альтэрнатыўнай інфармацыі пры выкарыстанні тэхнічных магчымасцяў камп'ютара, рэсурсаў сеткі Інтэрнэт; індывідуалізацыя працэса навучання, якая прадугледжвае арганізацыю рознапланавага суправаджэння і падтрымкі вучняў з боку настаўніка; павышэнне якасці і даступнасці адукацыйнага працэса, дзякуючы магчымасцям выкарыстання ў высокай ступені навучэнцамі камп'ютара і тэставых сістэм, заданняў для самакантролю і інш.; развіццё творчага і інтэлектуальнага патэнцыялу навучэнцаў за кошт павышэння самаарганізацыі, узаемадзеяння з сучаснай камп'ютарнай тэхнікай.

Выкарыстанне дыстанцыйных тэхналогій стымулюе і настаўніка да пастаяннай самаадукацыі і самаразвіцця, бо гэта мяркуе наступныя ўменні і навыкі: весці пошук у розных электронных даведніках, інфармацыйна-пошукавых сістэмах; арганізоўваць захаванне інфармацыі, яе аналіз і выбар адэкватных форм яе прадстаўлення з дапамогай сучасных мультымедыйных тэхналогій; выкарыстоўваць атрыманыя дадзеныя пры рашэнні канкрэтных творчых і праблемных задач.

## Літаратура

1. Вайндорф-Сысоева, М. Е. Методика дистанционного обучения: учеб. пособие для вузов / М. Е. Вайндорф-Сысоева, Т. С. Грязнова, В. А. Шитова; под общ. ред. М. Е. Вайндорф-Сысоевой. – М.: Юрайт, 2019. – 194 с.
2. Инструктивно-методическое письмо Министерства образования Республики Беларусь «Об использовании современных информационных технологий в учреждениях дошкольного, общего среднего и специального образования в 2021/2022 учебном году» от 09.08.2021.
3. Концепция информатизации системы образования Республики Беларусь на период до 2020 года / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : [б. и.], 2013. – с. 20.

## USIG REMOTE TECHNOLOGIES IN BELARUSIAN LANGUAGE CLASSES AND LITERATURE

**T.E. Volk**

Distance learning - a wide varietary of educational services, within which are involved in the distance, not being in a cool room. It solves tasks that are traditional training can not, it is above all: strengthening the active role of students in personal training, the use of available educational resources, the use of interactive forms of classes, improving motivation to learning, the presence of self-implementation, saturation and intensity of learning, The possibility of obtaining expert opinion of its participation.

**Keywords:** тraining motivation, cognitive activity, educational resources, Internet resources, Google-shaped.